# Як вучыць дзяцей паводзіць сябе пры гучанні Дзяржаўнага гімна

*Гучыць урачыста, як водгукі славы,*
*Гімн нашай вячыстай цудоўнай Дзяржавы...*
*Гімн свету сцвярджае, што любім мы працу,*
*А шлях наш лунае да радасці, шчасця.*
*Пад гукамі Гімна я моўчкі клянуся*
*Сапраўдным быць сынам маёй Беларусі!*
*Міхасъ Пазнякоў*

Добры дзень, паважаныя бацькі! Сёння хочацца павясці з вамі размову пра тое, як вучыць дзяцей паводзіць сябе пры гучанні Дзяржаўнага гімна. Але спачатку некалькі слоў пра Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой музычна-паэтычны твор, што выконваецца ва ўрачыстых выпадках, пералік якіх замацоўваецца ў заканадаўстве.

Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь мае сваіх аўтараў: музыку да яго напісаў беларускі кампазітар Н. Ф. Сакалоўскі, а словы – беларускія паэты М.М.Клімковіч і У.І.Карызна.

Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь выконваецца ў пачатку і ў шэрагу выпадкаў на заканчэнні важных дзяржаўных і грамадскіх падзей, у тым ліку пры ўступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на пасаду – пасля прынясення ім Прысягі.

Грамадзяне могуць выконваць (праслухоўваць) Дзяржаўны гімн у час народных, працоўных, сямейных свят і іншых урачыстых мерапрыемстваў пры забеспячэнні неабходнай павагі да яго.

Згодна вучбнай праграме дашкольнай адукацыі мы павінны фарміраваць у дзяцей правілы паводзін на цырымоніі ўздыму Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь і выканання Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь **(слухаць і выконваць гімн стоячы, хлопчыкам здымаць галаўныя ўборы).**

У дні дзяржаўных свят і агульнарэспубліканскія святочныя дні (Дзень народнага адзінства, Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Дзень Канстытуцыі, Свята працы, Дзень Перамогі, Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі), а ў выпадках, калі дзяржаўнае свята ці святочны дзень з’яўляецца непрацоўным днем, - у апошні працоўны дзень да усталяванай даты дзяржаўнага свята, святочнага дня, праводзяцца ўрачыстыя мерапрыемствы з абавязковым праслухоўваннем (выкананнем) Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, узняццем Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі ўстановы дашкольнай адукацыі (на пляцоўцы з устаноўленным флагштокам).